*Пролетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# ПЕРАМОГА

ОРГАН АНТОПАЛЬСКАГА РК КП (б) Б І ВЫКАНКОМА РАЙСОВЕТА ДЭПУТАТАЎ ПРАЦОЎНЫХ.

№ 38 (52) Пятніца, 24 жніўня 1945 г.

**ТАВАРЫШЫ СЯЛЯНЕ І СЯЛЯНКІ! ДАТЭРМІНОВА ВЫКАНАЕМ ДЗЯРЖАЎНЫ ПЛАН ХЛЕБАНАРЫХТОВАК 1945 ГОДА, СВОЕЧАСОВА І ВЫСОКАЯКАСНА ПРАВЯДЗЕМ СЯЎБУ АЗІМЫХ!**

## Зварот

### СЯЛЯН І СЯЛЯНАК ВЁСКІ РУДНЯ, ДАМАЧЭЎСКАГА РАЁНА ДА ЎСІХ СЯЛЯН І СЯЛЯНАК БРЭСЦКАЙ ВОБЛАСЦІ

Дарагія таварышы!

Гістарычныя дні перажывае Совецкі народ. Пад кіраўніцтвам вялікага Сталіна гераічная Чырвоная Армія, пры актыўнай падтрымцы ўсяго совецкага тыла, разграміла фашысцкую Германію і ўзнесла Сцяг Перамогі над Берлінам.

Зараз Чырвоная Армія вядзе гераічную барацьбу супроць японскай агрэсіі, каб хутчэй скараціць тэрміны заканчэння вайны Японіі з нашымі саюзнікамі, скараціць колькасць ахвяр і садзейнічаць хутчэйшаму аднаўленню ўсеагульнага міра.

Цяпер як ніколі перад намі стаіць задача яшчэ вышэй падняць магутнасць нашай любімай Радзімы, даць краіне і Чырвонай Арміі больш харчавання, сыравіны і ў першую чаргу хлеба.

Дасягненню гэтай благароднай задачы падпарадкавана ўся наша работа. Вясною мы, не шкадуючы сіл, працавалі над тым, каб больш і лепш пасеяць. З гэтай задачай мы справіліся і вырасцілі багаты ураджай.

Пачатак уборачных работ мы сустрэлі з вялікім уздымам і энергіяй, што дало нам магчымасць хутка і якасна правесці уборку азімых. Але гэта быў першы крок да вырашэння нашай задачы.

Мы зразумелі, што краіна, слаўная Чырвоная Армія, рабочы клас чакаюць ад нас хлеба, і мы рашылі датэрмінова разлічыцца з дзяржавай. На 7 жніўня мы поўнасцю разлічыліся з дзяржавай па збожжапастаўках.

Таварышы сяляне і сялянкі Брэсцкай вобласці, заклікаем усіх Вас паследваць нашаму прыкладу—разлічыцца датэрмінова з дзяржавай па збожжапастаўках. Заваюем першынства ў спаборніцтве з Пінскай вобласцю!

Няхай жыве наша Радзіма!

Няхай жыве наша Чырвоная Армія—пераможніца!

Няхай жыве вялікі Сталін!

Па даручэнню агульнага сходу зварот падпісалі: **Герасімчук Еўдакія, Фамельчук Філіп, Бай Якаў, Герасімчук Сцяпан, Бай Варфаламей.**



Калгас імені Чкалава, Будзёнаўскага раёна Стаўрапальскага края, першым у крае пачаў пастаўку збожжа дзяржаве.

На здымку: чырвоны абоз з збожжам калгаса накіроўваецца на элеватар.

**Фота Г. Аразкельяна.**

## БОЛЬШ ХЛЕБА КРАІНЕ!

### ЗБОЖЖА Ў ФОНД ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Слаўнымі патрыятычнымі справамі адказваюць сяляне вёскі Маленкова, Аніскавіцкага сельсовета на баявыя поспехі Чырвонай Арміі. На адбыўшымся 21 жніўня сходзе сяляне абавязаліся хутка і без страт убраць ураджай, датэрмінова разлічыцца з дзяржавай па хлебапастаўках. А сяляне, якія не маюць абавязацельстваў на пастаўку збожжа, рашылі добраахвотна здаць 3-4 пуды ў фонд Чырвонай Арміі. Так, 72-гадовы Крыволь Сямен Цімафеевіч падрыхтаваў для здачы 60 кілограм, 70-гадовы Крыволь Іосіф Нікалаевіч—50 кілограм і іншыя.

**П. З. Косцікаў.**

### ВЫКОНВАЮЦЬ СВОЙ ПЕРШЫ АБАВЯЗАК

З самай раніцы да позняга вечара працуюць на палях сяляне Асіпавіцкага сельсовета. Поўнасцю закончана ўборка азімых і завяршаецца ўборка ўсіх каласавых культур.

Адначасова з уборкай сяляне выконваюць свой першы абавязак перад Радзімай—пастаўку збожжа. На 20 жніўня на прыёмачны пункт сяляне здалі 6,5 тон збожжа.

Першымі ў сельсовеце разлічыліся з дзяржавай па збожжапастаўках сяляне вёскі Асіпавічы Ефім Каралюк, Грыгорый Ясько, Нікалай Вакульчык, Сцяпан Вакульчык і іншыя. План здачы збожжа дзяржаве выканалі таксама многія сяляне і другіх вёсак.

**Гардзіевіч.**

## АД СОВЕЦКАГА ІНФОРМБЮРО

**Аператыўная зводка за 21 жніўня**

На працягу 21 жніўня ў Маньчжурыі нашы войскі прадаўжалі прасоўвацца наперад. У паўднёвай часці вострава Сахалін нашы войскі занялі гарады Сікіга, Найоро, Усійоро (Унары), Маока.

За 20 жніўня нашымі войскамі ў Маньчжурыі ўзята ў палон 52 тысячы японскіх салдат і афіцэраў, у тым ліку камандуючы 1-м фронтам Квантунскай арміі генерал Кіта Сэйкі, камандуючы 3-м фронтам Квантунскай арміі генерал Усіроку Дзюн, камандуючы 3-й арміяй Квантунскай арміі генерал-лейтэнант Муракамі Кейсаку, камандуючы 5-й арміяй Квантунскай арміі генерал-лейтэнант Сімідзу Корыцуне.

Прыём капітуліруючых часцей і злучэнняў Квантунскай арміі прадаўжаецца.

**Совінформбюро.**

## У ГЕНШТАБЕ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

Прадстаўніком совецкіх войск пры генерале Макартуры назначан генерал-лейтэнант Дзеравянка, які гэтымі днямі прыбудзе ў Штаб генерала Макартура ў Маніле.

## РАТЫФІКАЦЫЯ ПРЭЗІДЫУМАМ ВЯРХОЎНАГА СОВЕТА СССР СТАТУТА АРГАНІЗАЦЫІ АБ'ЕДНАНЫХ НАЦЫЙ

20 жніўня 1945 года Прэзідыум Вярхоўнага Совета СССР ратыфіцыраваў Статут Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, падпісаны ў Сан-Францыска (ЗША) 26 чэрвеня 1945 года.

## ВЫПЛАТА ВЫЙГРЫШАЎ

Пры ўсіх сельсоветах арганізавана праверка білетаў Чацвертай грашова-рэчавай латарэі. Працоўныя атрымоўваюць выйгрышы. Раённая ашчадная каса выплаціла за ліпень па Чацвертай грашова-рэчавай латарэі 5.000 рублёў. Выйгрыш у 500 рублёў выпаў на 50 рублёвы латарэйны білет жыхаркі раённага цэнтра Олейнікавай і другіх.

# Міжнародны агляд

У раёне на Ціхім акіяне Японія пад ударамі нашых саюзнікаў страціла 1.000 самалётаў, сотні ваенных караблёў, вялікую колькасць дробных суднаў і амаль увесь гандлёвы флот. Але ў яе заставалася магутная сухаземная армія на астравах і лепшая, найбольш аснашчоная сіла — Квантунская армія ў Маньчжурыі. Без знішчэння японскіх армій было-б немагчыма ўстанаўленне трывалага міру на Далёкім Усходзе. Кіраўнікі ЗША і Англіі разумелі гэта і рыхтаваліся да дэсантных аперацый вялікага маштабу. „Гэтыя аперацыі,— заявіў у сваёй прамове ў новым парламенце былы прем'ер-міністр Англіі Чэрчыль, —патрабавалі-б нябачаных намаганняў і ніхто не мог вызначыць у колькі жыццяў англійскіх і амерыканскіх салдат яны абыйдуцца“.

Уступленне СССР у вайну супроць імперыялістычнай Японіі паскорыла разгром агрэсара на Далёкім Усходзе. Японія капітуліравала. Японскія войскі не спяшаліся складваць зброю, яны прадаўжалі супраціўляцца. Рашучае наступленне совецкіх войск карэнным чынам змяніла становішча. Японскія войскі здаюцца ў палон.

Японскі імператар і прадстаўнікі японскага ўрада імкнуліся нават у апошнія дні паказаць захопніцкую вайну, якая накіравана імі супроць народаў Азіі і ўсяго чалавецтва, як вайну, быццам вызваленчую. Некаторыя японскія газеты і зараз усё яшчэ выказваюць думку аб неабходнасці „выправіць памылкі“, якія прывялі Японію да паражэння. Яны мараць аб падрыхтоўцы новай вайны. Аднак такія разважанні і мары не выратуюць японскіх агрэсараў. Паражэнне Японіі стала фактам.

Японская дэлегацыя, якая прыляцела на самалёце ў сталіцу Філіпін—Манілу для папярэдніх перагавораў аб капітуляцыі, вымушана была паведаміць кіраўнікам штаба генерала Макартура звесткі аб размяшчэнні ваенных сіл, аб умацаваннях Японіі і іншыя ваенныя тайны.

Прадстаўніком совецкіх войск пры генерале Макартуры назначан генерал-лейтэнант Дзеравянка, які хутка прыбудзе ў Манілу.

Такім чынам узгодненыя дзеянні саюзнікаў прывялі, пасля паражэння Германіі, да хуткага разгрому і Японіі— агрэсіўнай дзяржавы на Далёкім Усходзе.

* * *

У Маскве 16 жніўня былі падпісаны дагавор аб совецка-польскай дзяржаўнай граніцы і пагадненне па пытанню аб пакрыцці страт, нанесеных Польшчы германскай акупацыяй. Польскія рэакцыйныя эмігранты, якія імкнуліся пасягнуць на беларускія, украінскія і літоўскія землі, спрабавалі пытанне аб граніцах ператварыць у вытокі вострых канфліктаў і варожасці. Цяпер гэтае пытанне вырашана ў духу дружбы двух славянскіх народаў, а польскія рэакцыйныя эмігранты аказаліся выкінутымі за борт гісторыі. Польска-совецкая граніца ўстаноўлена ў адпаведнасці з рашэннямі Крымскай Канферэнцыі ўздоўж так званай „лініі Керзана“ з некаторымі адхіленнямі ў карысць Польшчы.

Паспяхова вырашана пытанне аб пакрыцці страт, нанесеных гітлераўскімі захопнікамі Польшчы. Пакрыццё будзе ажыццяўляцца ў адпаведнасці з рашэннямі Берлінскай Канферэнцыі Кіраўнікоў Трох Дзяржаў натурай за кошт совецкай часткі рэпарацый з Германіі. Дагавор і пагадненне дапамогуць яшчэ больш умацаваць мір у Еўропе. Яны з'яўляюцца новым яскравым сведчаннем умацавання дружаскага супрацоўніцтва паміж СССР і Польшчай.

**В. Грышанін.**

В. а. рэдактара
П. СПІРЫДОНАЎ.

ГЛ 14850 Адрас рэдакцыі: г. Антопаль, Совецкая вуліца, дом № 2.